View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE



## ***Зробленае – застаецца!***

С. У. Калядка, *Максім Танк. Новыя факты, матэрыялы, інтэрпрэтацыі*, Мінск 2014, сс. 486

Гэтая кніга бачыцца як ненумараваны, але і неад'емны 14 том выдання Збору твораў Максіма Танка ў 13 тамах, якое ажыццяўлялася на працягу 1996–2012 гадоў. Вялікае па аб'ёму і падрабязнае даследаванне ўсёй спадчыны вялікага беларускага паэта, перакладчыка, палітычнага і грамадскага дзеяча, якое па сваёй маштабнасці не магло ўмясціцца ні ў форму каментарыяў, ні спасылак, ні дадаткаў у трынаццацітомніку – вось такое адметнае пасляслоўе падрыхтавала да друку Святлана Калядка, якая ад пачатку паклікання да жыцця тэксталагічнага калектыву вучоных была ў яго цэнтры адным з найбольш актыўных супрацоўнікаў, арганізатараў працы, вопытным і кампетэнтным архівістам.

Кампазіцыйна кніга ўяўляе сабою дзве панарамныя карціны. Адна з іх, якая займае каля ста старонак (I і II раздзелы), гэта панарама, па якой вядзе шматгадовы спецыяліст-праваднік, які падказвае, на што варта звярнуць асаблівую ўвагу, каб па меры сваёй падрыхтаванай магчымасці мець пэўную яшчэ і яшчэ пазнаўча-эстэтычную насалоду. Рыхтуючы на працягу 16 гадоў танкаўскі матэрыял да друку, С. Калядка ўзбагачала, несумненна,

свой, па-першае, даследчыцкі апарат, а па-другое, накаплівала значны “лішак” фактаў аб паэце як featured рознабаковай асобе, індывідуальнасці, а таксама аб ягонай творчасці. У раздзелах “З гісторыі падрыхтоўкі збору твораў Максіма Танка” і “Шляхамі Максіма Танка” гэтым “лішкам” ведаў якраз і дзеліцца аўтарка кнігі. Гэты матэрыял мае неацэннае значэнне для сённяшніх “танказнаўцаў” і наступных пакаленняў, тых, хто павінен, каму належыць у будучыні сказаць сваё новае слова ў літаратуразнаўстве.

Другая панарамная карціна, большая ў параўнанні з першай (360 старонак) – гэта сабраныя так званыя Дадаткі, з якіх найкаштоўныя, як зараз бачыцца, першыя пяць. Дадатак I дык можна разглядаць як саму па сабе ўнікальную кнігу ў кнізе пра творчую лабараторыю такой велічыні паэта, якім быў Максім Танк, і ўвогуле пра ягоную творчую псіхалогію. У гэтай частцы ўпершыню друкуецца 460 тэкстаў вершаў – іх чарнавыя накіды, рэдакцыі і варыянты. Ва ўступным слове С. Калядка са свайго, так бы мовіць, тэхнічнага пункту бачання, нейкай тэксталагічнай інжэнерыі слушна сцвярджае, што – і сабраўшы ўвесь матэрыял да гэтай сваёй кнігі-манаграфіі – *усё роўна застаецца ўражанне, што галоўнае слова пра вядомага і невядомага паэта Максіма Танка не сказана* (с. 3). Аднак далейшыя, – піша аўтарка, – *падступы да сапраўднага раскрыцця таямніц таленту* (падкрэслена. – *Я.Ч.*), бачацца спробаю падмяніць арганічна жывога, творча-духоўнага Танка Танкам механічным, якога можна “расшыфраваць” да апошняй паэтычнай клетачкі. Добра, што гэты аўтарскі тэзіс нідзе ў кнізе не стаецца катэгарычным імператывам. Зробленае С. Калядкай – застаецца!

*Ян Чыквін*
*Беласток*